

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 1 (262) СТУДЗЕНЬ 2019 ГОДА

БЕЛАРУСКІ АФАРЫЗМ

Хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае – асуджаны зноў перажыць яго. Безліч разоў

Уладзімір Караткевіч

ПАМЯЦЬ

ЛОСВИДСКАЯ ТРАГЕДИЯ УНИЧТОЖЕНИЯ СОВЕТСКИХ ДИВИЗИЙ

7 января 1944 года на Рождество Христово немцами на льду озера Лосвидо были растреляны пулеметами и артиллерией 11-я и 18-я гвардейские стрелковые дивизии, а также полк 235-й стрелковой дивизии. Спастись смогли не более 30 человек. Среднесписочная численность стрелковых дивизий в ту войну — около девяти тысяч солдат.

Валерий Абатуров, ведущий научный сотрудник НИИ (военной истории) Военной академии Генерального штаба ВС РФ, кандидат исторических наук в работе : «Наступление Калининского (1-го Прибалтийского) фронта на невельском, городокском и витебском направлениях» так описал историю Лосвидской трагедии: «После того, как разведка армии установила отсутствие врага на этом участке, генерал-лейтенант К.Н. Галицкий решил обойти его наиболее сильные опорные пункты по льду озера, протяженность которого с севера на юг составляла около 8 км. Для этого были выделены 11-я и 18-я гвардейские стрелковые дивизии, а также полк 235-й стрелковой дивизии.

Не встречая сопротивления противника, подразделения трех дивизий, двигаясь в колоннах, преодолели почти все озеро. Однако когда до южного берега оставалось несколько сот метров, они были встречены сосредоточенным огнем орудий, минометов и пулеметов. От разрывов снарядов и мин лед на озере был разрушен, и на его поверхности образовались обширные полыньи и участки с открытой водой. Итогом разыгравшейся трагедии стала гибель фактически всей группировки. Спастись смогли не более 30 человек.» http://encyclopedia.mil.ru

Известный поисковик, исследователь событий Великой Отечественной войны на Витебщине и Беларуси Бруева Л.Н. в книге «Пока не похоронен последний павший солдат....», 2009 года издания, так описывает поисковую работу по Лосвидской трагедии и те давние события:

«Подготовить объекты работ для поискового лагеря нам помогли письма-воспоминания ветеранов 11-й гвардейской и 43-й Армий, собранные советом музея боевой славы СШ-36 г.Витебска (создатель музея Валентина Васильевна Иванова). Из письма ветерана 235-й стрелковой дивизии Вадима Александровича Мисюрова, хранящегося в музее, мы узнали о трагедии, произошедшей на льду озера Лосвидо. Воспоминания ветерана и документальные материалы музея послужили основанием для выбора места проведения поискового лагеря.

24 декабря 1943 года войска 1-го Прибалтийского фронта (командующий генерал армии И.Х.Баграмян), развивая стремительное наступление, штурмом овладели городом и крупной железнодорожной станцией Городок — важным опорным пунктом обороны противника на Витебском направлении. Окрылённый этим успехом, командующий фронтом решает сделать новогодний подарок: освободить г.Витебск.

Преодолевая упорное сопротивление противника, наши войска продвинулись на 4 –5 км вперёд и оказались перед хорошо укреплённым рубежом противника. Внешняя линия обороны Витебска проходила в 25 км от города, представляя собой 2-3 линии траншей полного профиля, проволочные заграждения и минные поля. Второй рубеж обороны проходил в 6-8 км от первой в районе деревень Завязье — Городище — озеро Лосвидо. Был ещё и третий рубеж, он проходил в 5-8 км от города, по линии : река Пестуница — д.Михали — озеро Сосна…»

В книге «Память». г.Витебска Г.Г.Побережский — автор статьи «Прорвать оборону не удалось...» пишет, что задача овладеть городом к новому 1944 году была невыполнима (Книга Память. Витебск.-Мн., 2002, стр.528): «Казалось бы — 25 км! Но какими они стали для наших солдат и офицеров! Как свидетельствует командующий 11-й гвардейской армией генерал-полковник К.Н.Галицкий «...с 25 по 31 декабря 1943 года войска Армии продвинулись лишь на 5-7 км. За каждый метр отвоёванной земли, приходилось платить великую цену — многими жизнями советских воинов...»

«Ведя исследовательскую работу по Лосвидской трагедии в Центральном архиве Министерства обороны Российской Федерации, Игорь Николаевич Гутников переписал «Оперативные сводки 1 Прибалтийского фронта» за декабрь 1943 года, которые подтверждают сравнительно небольшое продвижение наших войск и выход к северной оконечности оз. Лосвидо:

«…В течение 29 декабря на Витебском направлении наши войска продолжали вести наступательные бои, в ходе которых заняли несколько населённых пунктов и среди них населённые пункты Козлы, Короли, Лосвидо, Угляне, Красный Двор...».

Командующий фронтом даёт указание послать армейскую разведгруппу к южному берегу озера Лосвидо,

(працяг на стар. 2)

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

РЫНАК ПРАЦЫ

ВАКАНСІІ З МІНМАЛЬНЫМ ЗАРОБКАМ

У сістэме адукацыі і культуры раёна прапануюцца вакансіі толькі з мінімальным заробкам,які ў два разы менш, чым на птушкафабрыцы. Дзяржаўная служба занятасці абнавіла базу даных аб вакансіях у Гарадоцкім раёне. Большасць прапануемых выкансій з мінімальным заробкам або крыху вышэй, што ў 2-3 разы менш рэкламуемага ўладамі заробку ў тысячу рублёў.

За апошні тыдзень абнавіўся Агульнарэспубліканскі банк вакансій па Гарадоцкаму раёну: http://gsz.gov.by . Спачатку свае вакансіі прапанаваў свінагадоўчы комплекс «Паўночны», потым сістэма адукацыі і з установ культуры, а сёння абнавілася базавакансійзптушкафабрыкі, сацыяльна-педагагічнага цэнтра і райбальніцы.

Пры гэтым пераважная колькасць вакансій са стаўкай толькі ў 330 рублёў. Гэта датычыцца работнікаў педагагічных прафесій — дэфектолагаў, псіхолагаў, выхавацеляў, трэнераў і г.д.. Аналагічныя стаўкі заробку і ў сістэме культуры — акампаніятараў, кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці, балетмайстраў, хормайстраў і г.д. Аналагічныя прапановы і для слесараў-сантэхнікаў, рабочых, павароў, электрыкаў з розных арганізацый раёна. Крыху больш прапануецца часам на свінагадоўчым комплксе «Паўночны» ў Пальмінцы: тут стаўкі вызначаны ў межах 400-450 рублёў, а начальніку аддзела і інжэнеру прапануецца адпаведна 650-700 рублёў.

Гарадоцкая птушкафабрыка 14 студзеня заявіла аб наяўнасці вакансій для токара, ветурача, заатэхніка са стаўкай у 600 рублёў і стаўкай для тэхніка па асяменненню з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй ў 1000 рублёў.

Большыя заробкі ў Гарадоцкім раёне прапаноўваюцца толькі ветэрынарнаму ўрачу-гінеколагу — 1200 руб. і начальніку малочна-таварнага комплекса — 1400 руб. з філіяла «Віраўлянскі» замежнага прадпрыемства «Дзецкасельскі-Гарадок». Толькі гэтыя прапановы былі анансаваны яшчэ ў лістападзе мінулага года. Дарэчы, самыя старыя вакансіі ў банку па Гарадоцкаму раёну датуюцца аж жніўнем мінулага года.

Ацэньваючы прапануемыя стаўкі для працы ў Гарадоцкім раёне варта адзначыць, што з 241 вакансіі не больш пяці маюць памер у 1000 рублёў, пра якія ўжо каторы год кажа кіраўнік нашай краіны. Але такі заробак массава знайсці на Гарадоччыне не рэальна. Вось і накіроўваюцца нашы суайчыннікі то ў Расію, то ў Польшу па годны ўзровень заробкаў.

Л. Антонаў

ТРАГЕДЫЯ

ТОВАРНЯК СБИЛ ПАРНЯ

В Городокском районе товарный поезд насмерть сбил 21-летнего парня.

21-летний житель Витебска шел по тропинке вдоль железнодорожных путей, когда его задел проходящий товарный поезд. Парень погиб, сообщает пресс-служба УВД Витебского облисполкома.

Сообщение о происшествии в милицию поступило от дежурного диспетчера железной дороги. Машинист грузового поезда, следовавшего в Россию, сообщил, что 12 января в 17.05 его состав в районе станции Грибачи Городокского района травмировал мужчину.

Прибывшая на место следственно-оперативная группа выяснила, что 21-летний житель Витебска приехал на станцию Грибачи, откуда пешком направился в деревню, откуда он родом, расположенную в нескольких километрах. Он шел по тропинке вдоль железнодорожных путей, когда его увидел машинист и начал ему сигналить. Машинист экстренно затормозил, но это не спасло парня — от полученных травм он скончался на месте происшествия.

Все обстоятельства случившегося уточняются.

Tut.by

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

ПАМЯЦЬ

(пачатак на стар. №1)

занятому фашистами (в район бывшей деревни Могучёва). Разведчики дошли до первого рубежа немецкой обороны. В траншее немцев почему-то не оказалось. До второй линии обороны не дошли. Армейская разведка, вернувшись к своим, доложила, что траншеи пустые — немцы отступили. Командующий 11-ой гвардейской Армией К.Н. Галицкий, не проверив данные разведки, приказывает: трем дивизиям — 11-й и 18-й гвардейским, 235-й стрелковой дивизиям, а также 89-й гвардейской танковой бригаде — рано утром, на Рождество, напрямую, через лед озера, догонять «отступающих фрицев».

Вот, что рассказывают очевидцы боёв: «Из нашей 235-й стрелковой дивизии, — писал в своем письме Мисюров Вадим Александрович (бывший помощник начальника 6-го отделения 235-й стрелковой дивизии), — в районе д. Залучье на северо-восточный край озера успел выйти только один из трёх полков без сопровождения артиллерии. Два других полка были на подходе к озеру. 11-я и 18-я гвардейские стрелковые дивизии в это время шли по льду озера правее. Немцы подпустили наших бойцов поближе, подогнали со стороны д.Батали бронепоезд, и из дальнобойных орудий и миномётов прямой наводкой накрыли наши наступающие части. Тысяч восемь бойцов осталось лежать убитыми на льду озера»

Валентина Васильевна Иванова — руководитель школьного музея боевой славы 43-й Армии рассказала нам, что встречалась когда-то с одним из участников той страшной трагедии на льду озера Лосвидо — участником Сталинградской битвы. Его фамилию она не запомнила, но сам рассказ по памяти записала:«Когда нас построили в колонну и приказали двигаться по открытому льду огромного озера, мне стало не по себе. Какое-то нехорошее предчувствие бередило душу. Мы, словно, шли в никуда... Тишина гробовая... Вдруг, когда прошли уже около 8 километров, и южный берег озера был совсем рядом, начался страшный артобстрел. Снаряды дальнобойных орудий со стороны шоссе били по нашим колоннам. От близкого уже берега, занятого фашистами, им вторили зенитные батареи противника. Нас расстреливали в упор. Очень немногим удалось уйти из-под огня в то страшное утро. Тысяч восемь, наверное, погибло на льду озера.

Когда начался артобстрел, я упал на лёд и прикрылся трупом. Целый день лежал на льду, боясь шелохнуться, так как немецкие снайперы добивали тех, кто ещё шевелился. А мороз всё крепчал... Лёд вокруг очень сильно покрошило снарядами. Целый день высматривал дорогу к своим между огромными полыньями... Когда стемнело, осторожно пополз к нашему берегу».

— А что с ним стало потом? — спросила я у Валентины Васильевны.

— Под утро у д.Залучье его подобрали солдаты и отправили в госпиталь, — ответила она. — Ему ампутировали отмороженные конечности. Так и жил инвалидом. Умер в 1978 году…»

«Готовя Вахту Памяти, мы решили уточнить на местах боёв данные архива и полученные в школьном музее сведения. А для этого необходимо было разыскать в окрестностях озера Лосвидо очевидцев боёв. Жительница д.Должа рассказала: «Когда начался сильный артобстрел, мы с мамой спрятались в погреб. Долго сидели там.

И только под вечер, когда стихла стрельба, осмелились выйти из хаты за водой к проруби. Меня удивило, что лёд в стороне Баталей был весь какой-то чёрный. Присмотревшись, поняла, что на льду лежат трупы... Когда в марте 1944 года выбили немцев от д.Могучёво, солдаты на лодках плавали между льдинами и вырубали останки погибших бойцов, вмёрзших в лёд озера. Но большинство трупов уже под лёд пошло, да и волки вовсю поработали...

Хоронили погибших бойцов в больших ямах — воронках вдоль берега озера. Много могил сразу было... Потом на месте д.Могучёво памятник поставили — голову солдата (может, видели на берегу стоит?).Только под памятником тем мало кто лежит. Могилы и не переносили вовсе — они вдоль всего берега остались. Когда памятник строили, заровняли все холмики на могилках, да ёлочки посадили. А в других местах вдоль берега озера могилки тоже остались не тронутыми, но они уж совсем заросли….».

…Витебские поисковики внимательно изучили переписку по потерям Управления учёта потерь рядового и сержантского состава Красной Армии со штабом 235-й стрелковой дивизии. В одной из телеграмм штаба фронта прочли: «Почему не шлёте потери за 7.1.1944 года?» Из дивизии ответили: «Потери за 7.1.1944 года высланы». Через несколько дней опять телеграмма: «Потери за 7.1.1944 года не получили».

Так по чьей-то халатности фамилии погибших на льду озера Лосвидо советских воинов канули в никуда. А возможно, в действительности было так, как пишет в своей исследовательской работе Гомонов Андрей Владимирович — руководитель научно-исследовательского кружка «Краеведы-поисковики»: «...в наступление отправили маршевые роты 11-й и 18-й гвардейских стрелковых дивизий. „Маршевая рота" — это люди — где-то собранные, кем-то посланные, трясущиеся в „теплушках" через весь могучий и великий Советский Союз: с Кавказа, Башкирии, Урала, Сибири... да мало ли ещё, откуда.... Как правило, на вновь прибывших бойцов не успевали составлять списки, даже на третьем году войны».

Остаётся надеяться, что и в других неучтённых воинских захоронениях вдоль оз.Лосвидо со временем найдутся награды и документы. Нет их фамилий в списках учёта потерь ни в сельсоветах, ни в военкоматах. Не удосужились установить их имена и при создании памятного знака погибшим гвардейцам, на месте бывшей д. Могучёво.» http://www.pobeda.witebsk.by

Прошло 75 лет с той трагедии, но полной картины нет и до этого времени. Как наверное не получится и похоронить последнего павшего солдата. Ведь уже выросло три поколения с того трагического январского дня, когда на льду озера Лосвидо было растреляно много тысяч советских солдат...

А мемориала этой трагедии ни в каких озвученных планах все еще нет и в преддверии 75-летия той мучительной победы....

Леонид Горовой

Полностью материал на сайте: http://haradok.info

КРЫМІНАЛ

ЖОРСТКАЕ ЗБІЦЦЁ ЖОНКІ

Малады муж у Гарадоцкім раёне «вучыў» сваю жонку паленам, шкляной бутэлькай, жаночымі ботамі, пяткай і кулаком.

Гарадоцкі РАУС паведаміў карэспандэнту «Гарадоцкага весніка» пра сямейны скандал на вёсцы, які перарос у драку з нанясеннем больш сотні ўдараў. Гэтыя ўдары рознымі прадметамі прывялі да пераломаў рэбер жонкі і крымінальнай справы адносна «выхавацеля».

Па інфармацыі «Гарадоцкага весніка» ў Гарадоцкі РАУС звярнулася 38-гадовая жанчына, якая паведаміла аб шматлікіх пабоях, якія ёй былі нанесены 25-гадовым мужам. Пры высвятленні абставін крымінальнага здарэння было выяўлена, што малады муж у сямейным скандале схапіў жонку за валасы, паваліў на падлогу і стаў біць. «Глава сям'і» нанёс жанчыне 40 ударaў жаночымі ботамі, 30 удараў кулаком і столькі ж пяткай. Потым выхавацель яшчэ нанёс 15 удараў шкляной бутэлькай і не менш 20 ўдараў паленам.

У выніку такой «педагогікі» жанчына атрымала закрытыя пераломы 8 і 9 рэбраў і не менш 50 кровападцёкаў. Гэтыя цялесныя пашкоджанні адносяцца да катэгорыі — менш цяжкія. Адносна «выхавацеля» ўзбуджана крымінальная справа па ч.2 арт. 149 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь.

Дадзеная частка артыкула прадугледжвае пакаранне «выхавацелю» ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да пяці.

Ці будзе чакаць жанчына свайго мужа пасля «перавыхавання» — вялікае пытанне.

Л. Антонаў

АХОВА ЗДАРОЎЯ

У ЛІДАРАХ ПА ВІЧ

Паказчык распаўсюджанасці ВІЧ на Віцебшчыне адзін з самых нізкіх у краіне і практычна ўтрая ніжэй агульнарэспубліканскага. У цяперашні час у рэгіёне пражывае каля 1,1 тыс. людзей з вірусам імунадэфіцыту. Найбольш нядобранадзейнымі па распаўсюджанасці захворвання з'яўляюцца Лёзненскі, Талачынскі, Полацкі, Гарадоцкі, Бешанковіцкі, Віцебскі, Расонскі, Дубровенскі раёны і Віцебск.

Віцебскае гарадское аддзяленне Беларускага грамадскага аб'яднання «Пазітыўны рух» абрана выканаўцам дзяржаўнага сацыяльнага заказу ў галіне прафілактыкі ВІЧ. Такое рашэнне прыняў аблвыканкам па выніках конкурсу.

Пра гэта паведаміла загадчык аддзела прафілактыкі ВІЧ / СНІД Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Валянціна Ананьева падчас пасяджэння абласнога міжведамаснага каардынацыйнага савета па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі і венерычных хвароб.

У рамках соцзамовы абласны бюджэт у канца 2018 года вылучыў больш за 1,9 тыс. рублёў на рэалізацыю асобных мерапрыемстваў падпраграмы «Прафілактыка ВІЧ-інфекцыі» Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016-2020 гады.

Сродкі накіраваны ў прыватнасці на аказанне сацыяльнай і псіхалагічнай дапамогі людзям з 4-й стадыяй захворвання і фарміраванне прыхільнасці да лячэння, якая ў сваю чаргу паляпшае якасць жыцця і зніжае вірусную нагрузку да неопределяемого ўзроўню.

«Пазітыўны рух» не першы год аказвае падтрымку віцяблянам, якія жывуць з ВІЧ, на базе арганізацыі дзейнічае Цэнтр сацыяльнага суправаджэння «Быць побач».

Як запэўніла Валянціна Ананьева, у далейшым плануецца пашырыць дадзеную дзейнасць, уключыць у сферу ўвагі ін'екцыйных наркаманаў і іншыя групы рызыкі ВІЧ-інфекцыі. Бюджэтныя сродкі на 2019 г. ужо прадугледжаны, а хто менавіта стане выканаўцам соцзамовы, зноў вызначыць конкурс.

Раней грамадскія арганізацыі, якія працуюць з дадзенай катэгорыяй грамадзян, атрымлівалі фінансаванне па розных праектах Глабальнага фонду. А сёньня плячо ім падставіла дзяржава.

Варта адзначыць, што дзякуючы намаганням усіх суб'ектаў прафілактыкі — медыкаў, праваахоўнікаў, грамадзян — паказчык распаўсюджанасці ВІЧ на Віцебшчыне адзін з самых нізкіх у краіне і практычна ўтрая ніжэй агульнарэспубліканскага.

У цяперашні час у рэгіёне пражывае каля 1,1 тыс. людзей з вірусам імунадэфіцыту

Больш за сто новых выпадкаў выяўлена за мінулы год. Усё часцей вірус передаецца палавым шляхам (па статыстыцы апошніх гадоў, больш за 90% агульнай колькасці інфіцыраваных) і атакуе ў асноўным людзей ва ўзросце 35-44 гадоў.

Найбольш нядобранадзейнымі па распаўсюджанасці захворвання з'яўляюцца Лёзненскі, Талачынскі, Полацкі, Гарадоцкі, Бешанковіцкі, Віцебскі, Расонскі, Дубровенскі раёны і Віцебск.

Паводле: "Віцебскія весці"

ПАЖАР

ПАМЁР ВЫРАТАВАНЫ МУЖЧЫНА

У Гарадоцкім раёне памёр мужчына, якога ратавалі на пажары.

Паводле даных Міністэрства надзвычайных сітуацый за мінулыя суткі з 6 гадзін раніцы 1 студзеня да 6 гадзін раніцы 2 студзеня па Беларусі на пажарах загінула 6 чалавек, з якіх чацвёра загінула на Віцебшчыне.

На Віцебшчыне загінулі грамадзяне ў Верхнядзвінскім раёне —мужчына 57-гадовага ўзросту, два мужчыны ў Чашніцкім раёне — 65 і 49 гадоў, а таксама памёр 1959 года нараджэння мужчына з Гарадоцкага раёна.

Нашага земляка ратавалі на пажары, які адбыўся ў апошні дзень мінулага года. Паводле інфармацыі прэс-службы Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС 31 снежня ў 20-12 у Гарадоцкі аддзел НС паступіла паведамленне аб пажары ў кватэры па вул. Рудыкі д. 7 ў в. Бычыха Бычыхінскага с / с. У выніку пажару ў кватэры ў пакоі 3×4 м былі пашкоджаны канапу, маёмасць, закураны сцены і столь. Насельніцтвам выратаваны быў гаспадар кватэры 1959 г.н ..

Пацярпелы з атручваннем прадуктамі гарэння, апёкамі рознай ступені цяжкасці шпіталізаваны ва ўстанову аховы здароўя. Але яго жыццё выратаваць не атрымалася.

Т. Гаражанка

ЭКАНАМІЧНЫЯ ВЫНІКІ

ВЫЖЫЦЬ НЯГЛЕДЗЯЧЫ НІ НА ШТО

Эканоміка Беларусі жыве паводле Курта Ванегута, які пісаў, што галоўнае дасягненне чалавецтва ў тым, што, нягледзячы на ўсё самазнішчэнне і самаразбуральнасць, яно «жыве і плануе выжыць надалей». І гэта, пэўна, самы вялікі плюс — як чалавецтва ў цэлым, так і беларускай эканомікі ў прыватнасці.



Што ж да эканамічных вынікаў года — яны не вельмі суцяшальныя. Але калі яны былі суцяшальныя?

Перамовы з Масквой

Глабальная спрэчка Лукашэнкі з Пуціным наконт «падатковага манёўру» Расіі — гэта, бадай, самы свежы прыклад таго, што можна назваць правалам у беларускай эканоміцы.

Канешне, можна шмат казаць пра тое, што Расія ў аднаасобным парадку парушыла «правілы гульні». Па-першае, пералічэнне ў беларускі бюджэт экспартных пошлін на нафту (яны знікаюць з увядзеннем «падатковага манёўру»), прадугледжвалася дамовай пра Еўразійскую эканамічную супольнасць. Па-другое, менавіта па настаянні Расіі стварэнне адзінага рынку энергарэсурсаў было перанесенае «да 2025 года». Каб не гэтае патрабаванне, уступленне ў дзеянне міжнароднай дамовы аб фарміраванні агульнага электраэнергетычнага рынку ЕАЭС павінна было адбыцца ў 2019 годзе — то бок амаль зараз. Пра гэта, у прыватнасці, казаў член калегіі (міністр) па энергетыцы і інфраструктуры ЕЭК Таір Мансураў у 2015 годзе.

Можна доўга разбірацца, хто каму вінен, — і гэтым, безумоўна, будуць шмат займацца ў наступным годзе. Але сам факт скандалу прадэманстраваў адно — вельмі вялікую эканамічную ўразлівасць «беларускай мадэлі развіцця». Канешне, некалькі соцень мільёнаў долараў на год на дарозе не валяюцца, але… Пабачыўшы гэтую істэрыю, Расія зразумела, як для нас важныя гэтыя грошы. І ў яе з'явіўся дадатковы рычаг шантажу беларускага кіраўніцтва…

«Па пяцьсот»

З аднаго боку, банкаўская сістэма працуе даволі добра. Афіцыйная гадавая інфляцыя амаль на 100 працэнтаў укладзецца ў спрагназаваныя паказчыкі. Курсы валют застаюцца больш-менш стабільнымі — нават калі ўзнікае нейкая турбулентнасць на расійскіх рынках. Улады ўстрымліваюцца ад звыклага нам сцэнару дэвальвацыі, хаця, можа, і хацелася б такім чынам «падняць» экспарт прадукцыі.

Але… Хто цягнуў за язык таго ж Румаса казаць, што «сярэдні заробак у верасні дасягне 1000 рублёў і больш зніжацца не будзе»? У выніку вераснёўскі заробак не вырас, а нават упаў. За кастрычнік Белстат казаў, што намінальны налічаны заробак склаў 999,7 рубля па краіне. Але «намінальны налічаны заробак» — гэта заробак без уліку падаткаў і збораў. Рэальны — ніжэйшы.

Нават калі ўлады дэманстратыўна «нагоняць» тысячу рублёў заробку ў сярэднім у снежні, гэта не будзе лічыцца дасягненнем. Каб мы ў гэта паверылі, такі заробак павінен пратрымацца хаця б паўгода. Ужо былі перыяды, калі ў адным месяцы ён перасягаў запаветныя «пяцьсот», а потым рэзка падаў.

І наўрад ці гэты паказчык будзе дасягнуты ў будучыні. Першы намеснік міністра фінансаў Юрый Селіверстаў, прадстаўляючы ў парламенце праект закона аб рэспубліканскім бюджэце на наступны год, сказаў, што сярэдні заробак бюджэтнікаў у Беларусі прадугледжаны да 810 рублёў.

Ён гэта прадставіў як «рост заробкаў». Але TUT.BY адзначыў, што ў мінулым годзе ўрад таксама агучваў планы, што да канца 2017 года ў бюджэтных арганізацыях будуць зарабляць у сярэднім па 800 рублёў. У выніку ў бюджэтных арганізацыях намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата ў 2017 годзе склала 618,7 рубля, у снежні мінулага года — 769,4 рубля. Намінальная. Не рэальная.

Няспраўджаныя спадзяванні

Напрыканцы 2017 года Аляксандр Лукашэнка падпісаў два маштабныя дакументы. Гэта былі дэкрэт №7 аб развіцці прадпрымальніцтва і дэкрэт №8 аб развіцці лічбавай эканомікі. На іх ускладаліся вельмі вялікія спадзяванні, якія пакуль не спраўдзіліся.

Прычым, дэкрэт пра прадпрымальніцтва не спраўдзіўся ў такой ступені, што кіраўнік прадпрымальніцкай арганізацыі «Перспектыва» Анатоль Шумчанка на сустрэчы ў снежні гэтага года заявіў: «Нас мэтанакіравана знішчаюць». І зноў — праблема ў ЕАЭС. Расія не выконвае нормы гэтай арганізацыі — прынамсі, не дае накладных дакументаў. А беларускіх прадпрымальнікаў, якія возяць рэчы з Расіі, прымушаюць такія дакументы мець. Канешне, кантралюючыя органы адмовіліся ад канфіскацыі тавару, але, з-за адсутнасці накладных, пакінулі канфіскацыю ад рэалізаванай выручкі да 50 працэнтаў, кажа Шумчанка. А калі такая накладная не адна?

Акрамя таго, набыла моц пастанова, згодна з якой арандатарам (чытай — камерсантам у любой гандлёвай кропцы) трэба пакрываць, акрамя арэнднай платы і камунальных плацяжоў, яшчэ і незразумелыя «выдаткі на ўтрыманне будынку». Што ўгэтае паняцце ўваходзіць, невядома. У выніку кошт «камуналкі» для прадпрымальнікаў вырас (месцамі, бо кожны вылічвае гэта па-свойму) у 14 разоў, і бізнес-саюзы нават вымушаныя былі звярнуцца з гэтай нагоды ва ўрад і Адміністрацыю прэзідэнта.

Што ж да дэкрэту №8 — Сінявокая думала пра блокчэйн, крыптавалюты, і іншае. Але «крыпта» (як, дарэчы, папярэджвалі многія) сталася «пірамідай», і зараз «майніць біток» (здабываць біткойн), пасля яго падзення на рынках, папросту нявыгадна. За 9 месяцаў 2018 года рэзідэнтамі Парку высокіх тэхналогій сталі каля 200 новых кампаній. Але мы пакуль не бачым іх дзейнасці «ў наяўнасці». Прынамсі, дагэтуль даведку пра заробак у «адно акно» даводзіцца дасылаць поштай (папяровай) ці прыносіць асабіста. З дамовамі і іншымі дакументамі дзяржорганаў — тое ж самае: «Раздрукуйце ў двух экземплярах, падпішыце і прынясыце нам».

Далёка, вельмі далёка нам да лічбавай краіны і галасавання па е-мэйле.

Што спрацавала

А вось што было добра для эканомікі і іміджу краіны — гэта беларускі «бязвіз». Толькі праз Нацыянальны аэрапорт у Мінску без айчыннай візы прайшлі 179 тысяч турыстаў, паведаміў намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл Кравец.

Пяцідзённы бязвізавы рэжым для грамадзян 80 краін быў уведзены з 12 лютага 2017 года. З 27 ліпеня 2018 года «бязвіз» быў падоўжаны да 30 дзён.

Больш за ўсё іншаземцаў праз Нацыянальны аэрапорт Мінск па бязвізавым уездзе прыехала за гэты час з Германіі — больш за 28 тысяч, з Польшчы — больш за 16 тысяч, Італіі — больш за 15 тысяч, Вялікабрытаніі і ЗША — прыкладна па 12 тысяч.

Бязвізавым уездам у Гродна і ў беларускую частку Аўгустоўскага канала з кастрычніка 2016 года скарысталіся больш за 134 тысячы турыстаў. Белавежскую пушчу і турысцка-рэкрэацыйную зону «Брэст» са студзеня гэтага года наведалі больш за 15 тысяч чалавек.

Гэта паказвае вялікі беларускі турыстычны патэнцыял. І, адпаведна, — грошы і імідж краіны. Аднак пакуль 30-дзённым «бязвізам» можа карыстацца толькі ў Нацыянальным аэрапорце. Чаму так? Незразумела. Але зразумела, што такія варыянты трэба пашыраць.

У цэлым вынік года такі: беларуская эканоміка не жыве — выжывае. Для таго, каб яна жыла, патрэбны істотныя змены правілаў гульні. І найперш нават не ў эканоміцы — у палітыцы. Патрэбнае прыняцце нармальных зразумелых законаў пра абарону інвестыцый, пра прыватызацыю, пра нармальную судовую сістэму, якая б абараняла інвестараў і прадпрымальнікаў. Патрэбная самастойная дзейнасць урада і, не баючыся гэтага слова, сапраўдны падзел уладаў на выканаўчую, заканадаўчую і судовую. І трэба ўрэшце неяк злезці з расійскай «нафтагазавай іглы».

Карацей, патрэбныя сістэмныя перамены. Хворага прастудай выратуюць пігулкі, але мы ўжо ў тым стане, што нам дапаможа толькі хірургічнае ўмяшанне.

Таццяна Лісічэнка
"Новы Час"

БЕЛАРУСЬ – РАСІЯ

«ДА ВАМ САМИМ НЕ ЗАХОЧЕТСЯ ВХОДИТЬ В РОССИЮ»

Несмотря на политические споры между Беларусью и Россией в последние месяцы, обычные люди продолжают ездить в гости друг к другу. Беларусь остается популярным направлением выходного дня для россиян. TUT.BY спросил у туристов из России, которые гуляют в эти дни по Минску, о делах насущных. Нужна ли странам «более глубокая интеграция»? Что они думают о нашей независимости, какие видят отличия между белорусами и россиянами?

«Когда политики говорят про „интегрироваться", вообще не понимаешь, что для них это может значить»

Мария и Максим приехали из Казани с сыновьями. Мария — учитель начальных классов, муж — преподаватель в техникуме. В Беларуси семья «раз десятый», потому что Максим отсюда родом.

— Минск моей молодости, Минск 90-х и даже начала нулевых — совсем разный город, — рассказывает Максим. — На наш взгляд, Минск с каждым годом становится более европейским.

По уровню жизни семья сравнивает столицу Беларуси с Казанью.

— Хотя наши знакомые приезжали сюда из Москвы, потом жаловались, вернувшись, что здесь люди бедные, бизнесу хода не дают, — какой-то другой совершенно взгляд. Не знаем, нам так не кажется.

— Недавно в Беларусь приезжал ваш премьер-министр Дмитрий Медведев. Предложил Беларуси более глубоко интегрироваться. Например, чтобы у стран были единая валюта, единый суд, парламент. Что вы думаете на этот счет?

— Политики когда говорят «интегрироваться», то вообще не понимаешь, что для них это может значить. Так как сейчас — хорошо, — уточняет Мария.

— На наш взгляд, больше, чем сейчас, интегрироваться не нужно, — говорит Максим. — Люди живут рядом, дружат и не мешают друг другу, а вот чтобы прямо одна экономика, одно государство — мне кажется, это лишнее.

Семья считает, что «самая соль» Беларуси в том, что это маленькое отдельное государство.

— Все-таки Россия — это империя и у нее везде имперские амбиции прослеживаются. Москва горит огнем, полыхает, а чуть съедешь в глубинку... Возможно, и у вас есть похожее, но все равно больше чувствуется, что люди относятся по-свойски, по-хозяйски к своей стране…

«Зачем единый президент? В России и так „президент" города, „президент" области, президент страны»

Ирина и Евгений — из Нижнего Новгорода, Ирина — врач, Евгений — строитель. Они ездят в большие выходные в разные российские города и в теплые страны, а теперь вот решили посмотреть Беларусь. Попутно россияне сокрушаются, что в эти дни из Минска почти невозможно добраться в Хатынь: туристов туда организованно отказываются везти.

По их оценкам, уровень жизни минчан соотносим с уровнем жителей Нижнего Новгорода. Цены тоже соотносимые, только в Минске дешевле проезд на общественном транспорте и шоколад.

Что касается политики, тут семья уверена, что «между простыми людьми мосты давно уже наведены».

— Это политики что-то делят, а на наш взгляд, ничего менять не надо.

— Но в Союзном договоре у нас говорится о единой валюте, едином суде...

— Зачем это? У вас свой устав, у нас — свой. Будем добрыми соседями, но не нужно лезть со своим уставом в чужой монастырь.

— И единого президента не надо?

— Зачем? У нас и так президентов хватает: «президент» города, «президент» области, президент страны...

(скарочана)

tut.by

КАНФЕРЭНЦЫЯ

НЯ ТРАПІЦЬ У ПАЛОН «РУССКОГО МИРА»

Канфэрэнцыя «Беларуская дзяржаўнасьць. Гісторыя і сучаснасьць», якая прайшла ў Віцебску 5 студзеня, узьняла пытаньні: станаўленьня беларускай нацыі; утварэньня беларускай дзяржаўнасьці; пэрспэктывах яе захаваньня ва ўмовах расейскага эканамічнага і інфармацыйнага ўплыву.

Канфэрэнцыю арганізавалі прадстаўнікі гарадзкой дэмакратычнай супольнасьці — запрасілі вядомых сталічных навукоўцаў і мясцовых дасьледчыкаў. Актавая заля абласной бібліятэкі была поўнай: слухачы на канфэрэнцыю прыехалі нават з рэгіёнаў.

«Віцебск – гэта Беларусь, а не пляцоўка для стварэньня «саюзаў» з Расеяй»

Размове пра беларускую ідэнтычнасьць і дзяржаўнасьць папярэднічала ўскладаньне кветак да помніка вялікаму князю Альгерду, які неаднаразова «прыхіляў дзіду сваю да брамы маскоўскае». У часы яго кіраваньня сярэднявечны Віцебск дасягнуў найвышэйшага росквіту, і гэтую постаць гараджане лічаць увасабленьнем моцы і самабытнасьці горада.

Ідэя правесьці канфэрэнцыю, падкрэсьліўшы адметнасьць Віцебску насуперак распаўсюджаным меркаваньням пра тое, што гэта «самы расейскі» з усіх беларускіх гарадоў, зьявілася паўгода таму. Пра гэта распавёў у пачатку імпрэзы яе ініцыятар Хрыстафор Жаляпаў…

Падчас канфэрэнцыі выступоўцы неаднаразова згадвалі і выказваньне Аляксандра Лукашэнкі пра тое, што «Магілёў — больш расейскі, чым беларускі», бо за гэтымі словамі праглядаецца і ўмоўная паралель зь Віцебскам. Абодва гарады знаходзяцца на памежжы з Расеяй, і абодва ледзьве ня сталі яе часткай неўзабаве пасьля абвяшчэньня БССР — дакладней, ССРБ (Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь), якое адбылося ў пачатку студзеня 1919 г. у Смаленску.

Ці было гэта праявай свабоднага волевыяўленьня беларускага народу, як пісалі ў савецкіх падручніках, калі стварэньне БССР ініцыявалася «з Крамля»? Якімі былі сапраўдныя мэты расейскіх стваральнікаў «беларускай дзяржаўнасьці», што кіраваліся парадай Уладзіміра Леніна пра стварэньне «буфэрнай рэспублікі» на мяжы с Польшчай? Пра гэта распавяла дасьледчыца Ніна Стужынская, падкрэсьліўшы, што фармулёўка пра «мару беларусаў стацца часткай вялікай сацыялістычнай краіны» выглядае сумнёўным нават для сучасных беларускіх уладаў.

Невыпадкова 100 год БССР гучна не адзначалася на дзяржаўным узроўні, а дазвол на сьвяткаваньне стагодзьдзя БНР улады ўсё-ткі далі, лічыць дасьледчыца. Аднак у сучасных падручніках па гісторыі Беларусі, перапрацаваных у канцы 1990-х, паўтараецца прасавецкая вэрсія выкладаньня падзеяў, канстатавалі слухачы.

Віцебск, Полацак і Ворша — эўрапэйскія гарады, але памяць пра гэта зьнішчылі

З паведамленьнямі пра гісторыю гарадоў Віцебшчыны выступілі гісторыкі Сяргей Тарасаў і Ігар Цішкін, краязнаўцы Міхась Баўтовіч і Ігар Казьмярчак. Яны казалі пра адметнасьці, што сьведчаць пра адрознасьць лёсаў Віцебска, Полацка і Воршы ад расейскіх гарадоў.

Адметнае архітэктурнае аблічча таго ж Віцебска ў большай частцы страчанае, падкрэсьліў Цішкін.

«Віцебск паўставаў як эўрапэйскі горад. Але віцебскім уладам заманулася паставіць тут помнік княгіні Вользе, якая нібыта заснавала горад, — паставіць насуперак гістарычным фактам. Кіраўнікі гораду ня дбаюць пра аднаўленьне архітэктуры, страчанай ня толькі падчас апошняй вайны, але й зьнішчанай сьвядома ў паваенны час. Затое ў нас ёсьць помнік Пушкіну і «залатой рыбцы». Нібыта ў культурнай палітыцы ўлады ўвасабляюць колішняе выслоўе Хрушчова — «чым хутчэй мы загаворым па-расейску, тым хутчэй збудуем камунізм», — кажа гісторык.

Пра расейскі інфармацыйны ўплыў, у якім патанае Віцебск, дый іншыя беларускія гарады, разважаў мясцовы журналіст Зьміцер Казакевіч. Зь ягоных назіраньняў, гэта ўплыў перадусім тэлевізійны — як расейскіх тэлеканалаў, так і мясцовых, што ствараюць пераважна расейскамоўны кантэнт. Супрацьпаставіць гэтаму практычна няма чаго: у Віцебску няма ніводнай беларускай клясы, тым болей — школы, зазначыў пачэсны сябра абласной рады ТБМ Ёсіф Навумчык.

Рыхтавацца да нішчымніцы, але пашыраць беларушчыну

Паводле палітоляга Андрэя Ляховіча, які разважаў пра пэрспэктывы адносінаў з Расеяй, Лукашэнка наўрад ці пагодзіцца ахвяраваць незалежнасьцю Беларусі дзеля эканамічнай расейскай падтрымкі. Бо гэта пагражае ягонай асабістай бясьпецы праз страту пазыцыі кіраўніка дзяржавы. Але ў такім выпадку Расея можа пазбавіць Беларусь нафтавых датацый, а гэта пацягне за сабой эканамічны спад і зьбядненьне насельніцтва.

Аднак, незалежна ад далейшай хады падзеяў, беларусам варта дбаць пра захаваньне нацыянальнай ідэнтычнасьці. Асабліва тут, у памежных рэгіёнах, дзе ўплыў «рускага сьвету» найбольш адчувальны. Таму ўдзельнікі канфэрэнцыі выклалі тэзы, якія варта ўключыць у рэзалюцыю да накіраваць яе ўладам пасьля канчатковай дапрацоўкі. Сярод патрабаваньняў віцяблянаў — абмежаваньне прапагандысцкіх перадач расейскіх тэлеканалаў, стварэньне беларускамоўных клясаў, забарона дзейнасьці шэрагу грамадзкіх аб'яднаньняў і інтэрнэт-паблікаў прарасейскага накірунку.

Але самае істотнае, пагадзіліся ўдзельнікі канфэрэнцыі, — гэта пашырэньне беларушчыны на ўласным прыкладзе: ня быць абыякавымі да праяваў чужога гвалтоўнага ўплыву, паведамляць пра кожны выпадак антыбеларускай агрэсіі ў адпаведныяворганы і ў СМІ, і самім «лезьці ў скрыню», зважаючы на прапагандысцкі магчымасьці тэлевізіі.

БС
"Радыё Свабода"

КОНФЛИКТ

СТАНЕТ ЛИ ЛУКАШЕНКО ДРАЗНИТЬ ИМПЕРИЮ?

В дни новогоднего информационного безрыбья российские СМИ охотно обсасывают тему возможной инкорпорации Беларуси. Тема вдруг стала топовой после «ультиматума Медведева» от 13 декабря и двух последующих бесплодных встреч Владимира Путина с Александром Лукашенко, перед которым поставили ребром вопрос «продвинутой» интеграции (иначе субсидии будут стремиться к нулю).

В заявлениях московских комментаторов много обидного, цепляющего, трактовки часто однобокие, факты искажаются. Однако эмоциональный белорусский лидер стоически молчит. Белорусская государственная пресса, как обычно, зеркалит его позицию.

В России прикидывают, по зубам ли Беларусь

Вообще-то Лукашенко обнажил подоплеку предложений премьера РФ Дмитрия Медведева на следующий же день, 14 декабря, расшифровав побуждение к союзному строительству по полной программе, в соответствии с договором 1999 года, как призыв разрушить страну и вступить в Россию.

Но потом белорусский президент приглушил звук, а по итогам переговоров, прошедших в Кремле 29 декабря, и вовсе не проронил ни слова.

Между тем показательно, в каком ключе обсуждается острейший с точки зрения белорусской независимости вопрос в СМИ восточных соседей. Тамошние комментаторы рассуждают, например, самый ли это удобный для Путина способ продлить свою власть после 2024 года (может, проще переделать конституцию?). Или — удастся ли России переварить такой кусок, найдутся ли деньги на «еще один Крым».

Мыслью, что лишать соседей государственности в принципе не комильфо, никто особо не грузится. Зато звучит такое соображение: а кто там будет так уж цепляться за суверенитет, если практически все по-русски говорят? Типичная для московского взгляда на «ближнее зарубежье» ошибка: русскоязычные — значит принадлежат к «русскому миру» (и, конечно, жаждут воссоединиться).

Белорусского президента троллят и гнобят

Много обидного восточные соседи пишут, говорят в эфире и лично о Лукашенко. Обвиняют в иждивенчестве, нахлебничестве, двуличии. После совещания, которое он провел 24 декабря, российские СМИ выстрелили заголовками в духе «Лукашенко отказался называть Россию братской».

То есть с точностью до наоборот. Ведь руководитель Беларуси тогда заметил, что вынужден менять лексику: «Я уже не говорю „братским государством", потому что, как меня информируют, в России это не воспринимается. Якобы пришли новые люди, которым это понятие неприемлемо. Что же, будем партнерами».

На сайте «Московского комсомольца» 29 декабря вышла публикация под заголовком «Подавленный Лукашенко сдался Путину: общая власть России и Белоруссии». Заголовок явно высосан из пальца, из текста никак не следует, что белорусский руководитель сдался. Но это характерная для российских СМИ подача темы.

Вдобавок последние дни декабря ознаменовались вбросами через телеграм-каналы, социальные сети в духе: «батька» перед Новым годом выступит с отречением от власти.

Конечно, никакого «я устал, я ухожу» не прозвучало. Но иные белорусские патриоты были разочарованы тем, сколь невнятным, беззубым оказалось новогоднее обращение официального лидера: а где про готовность идти в землянки ради независимости и все такое?

Московские же СМИ и в этом спиче усмотрели тайные антироссийские смыслы: мол, «батька» ничего не сказал о более тесной интеграции…

Сжигать мосты Лукашенко не рискнет

По мнению же Валерия Карбалевича, эксперта аналитического центра «Стратегия» (Минск), белорусские власти пока в принципе «не определились, что делать» в контексте «ультиматума Медведева».

«Лукашенко чего-то ждет. Возможно, некие двери остались открытыми», — отметил аналитик в комментарии для Naviny.by.

Публичный скандал белорусское руководство если и надумает устроить, то он будет дозированным, умеренным, предполагает собеседник: «Сжигать мосты Лукашенко не станет».

Кроме компенсации за налоговый маневр в нефтяной сфере, вокруг чего сейчас идет главный торг, от Москвы зависит еще очень многое — и цена на газ, и кредиты, и условия доступа белорусской продукции на российский рынок. Минску есть что терять, напомнил Карбалевич.

Он не думает, что даже в ситуации затяжного конфликта с Москвой власти дадут больше свободы негосударственным СМИ. Скорее, вероятно продолжение точечных репрессий, в частности против спутникового телеканала «Белсат», прогнозирует аналитик.

Добавлю: возможно, наверху цинично полагают, что независимые медиа так или иначе будут принципиально стоять на позициях защиты суверенитета. А дай этим журналюгам свободнее дышать — греха не оберешься.

У всех авторитарных режимов — экзистенциальный страх перед неподконтрольной прессой, а теперь вот — перед интернетом. Белорусские начальники не успевают, бедолаги, переписывать закон о СМИ в тщетных надеждах обуздать Сеть…

Да, еще есть время лавировать и есть шанс что-то выцарапать у Москвы. Более двух десятилетий такая тактика по большому счету приносила Минску успех. Но, как говорят белорусы, «да пары збан ваду носiць». В какой-то момент может оказаться, что в надежде сохранить все как было — все бездарно проиграно.

Александр Класковский
"Белапан"

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V), Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 16.1.2019 у 19.40
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.